# АБ ЖАНРАВА-СТЫЛЯВЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ ДРАМЫ М.ГАРЭЦКАГА "ЧЫРВОНЫЯ РУЖЫ"

М.М. Караткоў (г.Магілёў)

"Чатыры абразкі мінулага жыцця" "Чырвоныя ружы" (1922) мащь нямала агульных з "абразамі жыцця" "Антон" (1914) адметных рыс. Праблематыка абодвух твораў патэнцыяльна раманная – гістарычны лёс беларускага народа. Як і "Антон", "Чырвоныя ружы" таксама хутчэй "драма для чытання", чымся драма. А.А.Семяновіч слушна зазначаў, што "Чырвоныя ружы" не вельмі прыдатныя для пастаноўкі на сцэне.[1] Асобныя маналогі персанажаў, блізкія па-свайму характару да маналогаў унутраных, занадта зацягнутыя, што, як і ў "Антоне", замаруджвае развіццё падзей. Рэмаркі да ўсяго твора і асобных яго сцэн, вельмі важныя, як і ў "Антоне", для разумення аўтарскай ідэі, у асобных момантах не могуць быць "перакладзены" на мову сцэны.

Але ў "Антоне" М.Гарэцкі, закранаючы праблему "героя новага часу", даследваў рэчаіснасць пераважна ў "сінхранічным разрэзе". У "Чырвоных ружах" мастак слова, зыходзячы з новага гістарычнага вопыту, імкнецца да асэнсавання галоўных заканамернасцей гісторыі. А таму даследуе рэчаіснасць пераважна ў "дыяхранічным разрэзе". Калі ў "Антоне" на першы план выступаў маральна-этычны бок канфлікту, то ў "Чырвоных ружах" акцэнт зміяччаецца на яго сацыяльны аспект, некалькі "прыглушаны" ў "Антоне". Усяго ў чатырох невялікіх сцэнках пісьменнік паказаў, як на працягу стагоддзяў абвастраўся канфлікт паміж прыгнечанымі і прыгнятальнікамі. Як паступова ўзмацнялася барацьба народных мас супраць эксплуататараў, змяняліся яе формы – ад пасіўнага пратэсту да рэвалюцыі.

Аднак "Чырвоныя ружы" правамернеи адносіці да жанру сацыяльна-філасофскай, а не гістарычнай драмы. Зазначым, што аўтар канцэнтруе ўвагу не на нейкім пэўным перыядзе ці падзеі. Аб"ектам адлюстравання і даследвання сродкамі мастацтва з"яўляецца не столькі, можа, сама гісторыя народа, колькі галоўная тэндэнцыя развіцця грамадства. Таму ўсе факты, якія не надта паказальныя ў гэтых адносінах, проста ігнаруюцца. А блізкія па сваёй сутнасці з"явы як бы аб"ядноўваюцца ў адну, што мае вынікам разыходжанне з гістарычнай фактаграфіяй, храналагічную неакрэсленасць асобных падзей.

---

[1] Семяновіч А.А. Ад вытокаў да сталасці: Беларуская драматургія 1917-1945 гг. – Мн., 1978. – С. 19.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Так, напрыклад, у "абразку" "Вольніца крывава" падзеі адбываецца "цераз колькі год" пасля скасавання прыгоннага права. Але аб якім канкрэтна паўстанні (1963 года ці ранейшых) гавораць пан, сказаць цяжка. Не лягчэй здагадацца аб тым, якое паўстанне маецца на ўвазе ў оцэне "Нех жые Польска!" Ці тое гаворыцца пра 1794 год, ці тое -- пра 1830-1831 гады... Або гэтыя гістарычныя факты пісьменнік "зводзіць у адно"? Ясна толькі, што паўстанне адбываецца да рэформы 1861 года і мае на мэце аднаўленне Рэчы Паспалітай у яе колішніх межах.

Урэшце, думаецца, аўтар і не імкнуўся да адлюстравання канкрэтных гістарычных падзей. Для яго, відаць, важней было выявіць агульнае ў шэрагу падобных паміж сабой з"яў. Заўважым адзін цікавы момант: пан, які толькі што прымушаў хлопаў-беларусаў працаваць на яго і ў свята, з прыездам эмісара польскага паўстанцкага ўрада пагаджаецца нават з неадкладнай адменай прыгоннага права. Сапраўдныя матывы такой цудоўнай змены поглядаў раскрываюцца ў дыялогу пана і эмісара:

Начальнік. ... Польска паўстане з мёртвых, хоць далей нам будзе значна цяжэй. Беларусы блага разумеюць нашы мэты. Трэба пацягнуць іх ласкаю. Трэба зараз абвясціць ім, пане, вольніцу ад польскага нацыянальнага ўраду...

Пан: Але ж, пане, гэтак толькі мовіцца?.. Хлопы заастануцца нам? (...)

Начальнік. Як выйграем справу, высокі сойм зробіць свае справядлівыя пастановы... нікога не пакрыўдзіць. Панства абывацельства будзе задаволена за свае ахвяры. А цяпер мусіць абвясціць хлопам волю! [1]

Нешта падобнае адбывалася і ў новы час, калі ўрад панскай Польшчы падлабрываўся да беларускіх нацыянал-адраджэнцаў, каб потым, умацаваўшы свае пазіцыі, перайсці ад дэмагогіі да жорсткай эксплуатацыі "хлопаў" з "усходніх крэсаў" і асіміляваць іх. Такім чынам, змест твора, хаця часовыя рамкі падзей і абмежаваныя ў ім 1917 годам, "працыраваўся" і на сучасную для аўтара рэчаіснасць, што пацвярджае правільнасць нашага вызначэння жанравых асаблівасцей "Чырвоных рук".

---

[1] Гарэцкі М. Чырвоныя рукі. Гарэцкі М. Збор твораў у 4т. - Т.2. - Мн., 1985. - С. 319.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова